# ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ І ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ

## Вядомага дзяржаўнага дзеяча Аляксея КАМАЯ з 90-годдзем віншавалі ў Палаце прадстаўнікоў

Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзім ІПАТАЎ зачытаў віншавальны адрас ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, у якім кіраўнік дзяржавы выказаў Аляксею Сцяпанавічу словы падзякі за працу і адданасць Айчыне. Беларускі лідар адзначыў, што яго багаты вопыт партыйнай і дзяржаўнай работы, мудрасць, актыўная жыццёвая пазіцыя і сёння дапамагаюць у будаўніцтве моцнай і суверэннай Беларусі, спрыяюць выхаванню грамадзянскасці і патрыятызму, асабліва ў маладзёжным асяроддзі.



Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што Аляксей Камай стаяў каля вытокаў беларускага парламентарызму — з'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў першага склікання. У знак асаблівай удзячнасці і прызнання заслуг юбіляру таксама ўручылі падзяку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергяенкі.

Гаворачы пра асобу Аляксея Камая, **старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ** ў размове з журналістамі адзначыла, што на розум прыходзяць такія чалавечыя якасці, як адказнасць і пачуццё абавязку: «Гэта вялікі патрыёт нашай краіны. Аляксей Сцяпанавіч зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Дзе б ён ні працаваў — ці то гэта сельскагаспада́рчы кірунак дзейнасці, ці то камсамольская работа, ён заўсёды падыходзіў да справы вельмі адказна і рашуча». Па словах дэпутата, жыццёвая пазіцыя Аляксея Сцяпанавіча непарыўна звязана з патрыятызмам, любоўю да Радзімы і вялікай адказнасцю.

**Яна ВАЛАСАЧ**
**Фота БелТА**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ